# ПРАДМОВА ДА БЕЛАРУСКАГА ВЫДАННЯ

Апошнім часам даследаванні гісторыі Вялікага Княства Літоўскага перажываюць, бадай, перыяд найбольшага ўздыму. Асабліва інтэнсіўна яны развіваюцца ў краінах, якія традыцыйна ўсведамляюць сябе спадкаемцамі гэтай сярэднявечнай і ранненавачаснай дзяржавы. Павялічваецца колькасць супольных акадэмічных і выдавецкіх ініцыятыў, якія не толькі дазваляюць лепш пазнаёміцца з найноўшымі дасягненнямі іншых нацыянальных гістарыяграфій, але і дапамагаюць ствараць міжнародную традыцыю даследаванняў Вялікага Княства Літоўскага, якая пераадольвае межы нацыянальных гістарыяграфій. Сучасныя нацыянальныя ўяўленні і паняцці няшмат дапамагаюць зразумець сацыяльнае жыццё людзей дамадэрнага грамадства. Асабліва гэта трэба сказаць пра прадстаўнікоў знаці, ідэнтычнасць якіх была складанаю і пастаянна мянялася. Ад самага пачатку дзяржаўнасці Літвы ў палітычную эліту краю інтэграваліся групы людзей рознага этнічнага паходжання і розных канфесій. Напрыклад, у пачатку XIII ст. літоўскае войска вёў герсіцкі князь Усевалад, ваярамі караля Міндаўга кіраваў Хвал, а знакамітымураднікам вялікага князя Гедзіміна быў гарадзенскі староста Давыд. Спатрэбілася ўсяго толькі адно ці два пакаленні, каб на новым месцы прадстаўнікі знаці змянілі сваю канфесійную і этнічную тоеснасць. Князі Гальшанскія, што паходзілі з глыбіні паганскай Літвы, у XV ст. у Кіеве ўжо трактаваліся як мясцовыя «князі кіеўскія», а Хадкевічы, што паходзілі з праваслаўных зямель, у XVI ст. фіктыўна выводзілі сябе ад «літоўскага» баярына Барэйкі. Даследаванні эліты ўлады выразна паказваюць, што пры фармаванні палітычных груп найзначнейшымі былі крытэрыі роднаснасці і тэрытарыяльныя, а не канфесійныя і нацыянальныя. Разгледжаная ў гэтай кнізе знаць XIV і XV ст. — гэта прадстаўнікі «палітычнай літоўскай нацыі», што нараджалася ў гэты час, яны разам з пануючай дынастыяй Гедзімінавічаў стварылі Вялікае Княства Літоўскае.

З’яўленне перакладу гэтай кнігі важнае і дзеля таго, што немалая частка вотчынных зямель у Вялікім Княстве Літоўскім XV ст. месцілася на тэрыторыі сучаснай Беларусі — у ваколіцах

Ашмянаў, Крэва, Ліды, Наваградка. Жыццё і дзейнасць знаці паміж Вільняй і Геранёнамі, Салечнікамі і Полацкам, Вількамірам і Горадняй, Кернавам і Нясвіжам — гэта цудоўнае сведчанне інтэгральнасці палітычнай прасторы і яе гістарычнай традыцыі. І хоць са спадчыны прадстаўнікоў тагачаснай эліты засталося няшмат, назвы іх маёнткаў нагадваюць пра старыя цэнтры палітычнага і сацыяльнага жыцця.

За ініцыятыву перакласці гэтую кнігу дзякую выдавецтву ARCHE, а за пераклад складанага тэксту — калегу Алесю Мікусу. За час ад з’яўлення кнігі па-літоўску (2003) па гэтай тэме апублікаваныя і новыя даследаванні. Іх вынікі адлюстраваныя ў дапоўненых прасапаграфічным спісе ды спісе ўраднікаў.

**Рымвідас Пятраўскас**
**Вільня, Каляды 2011 г.**